Установа адукацыі
«Беларускідзяржаўныўніверсітэткультуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па навуковай рабоце
БДУКМ
______________ В. Р. Языковіч
«___» _____________ 2020 г.
Рэгістрацыйны № ВД-_____/вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ФІЛАСОФІЯ МОВЫ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне дляўсіх спецыяльнасцей універсітэта*

2020

Вучэбная праграма складзенана аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі цыкла сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, зацверджанага 15.07.2014, і вучэбных планаў спецыяльнасцей універсітэта

**СКЛАДАЛЬНІК**
*А.І. Бабко*, дацэнт кафедры філасофіі і метадалогіі гуманітарных навук установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат філасофскіх навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*М.В. Анцыповіч,* дацэнт кафедры філасофскіх вучэнняў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт», кандыдат філасофскіх навук, дацэнт;
*Т.С. Жылінская,* дацэнт кафедры інфармацыйных тэхналогій у культуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
кафедрай філасофіі і метадалогіі гуманітарных навук установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 9 ад 16.05.2018);
прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 21.06.2018)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: А.І.Бабко

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Моўна-філасофскі дыскурс займае выдатнае месца ў разгортванні сучаснай філасофскай думкі: у шмат якіх з яе ўплывовых кірункаў моўнай праблематыкі надаецца найгрунтоўнейшае значэнне і ніякі з іх не пакідае дадзеную праблематыку па-за ўвагай. Дадзеная сітуацыя абумоўліваецца найперш універсальным характарам мовы, у стыхіі якой здзяйсняецца і наша духоўнае жыццё ўвогуле, і кожная з яго праяў, у тым ліку і ўсе кірункі філасофскіх пошукаў. Філасофія мовы высоўваецца ў такіх умовах на пярэдні план у сістэме філасофскіх дысцыплін, выяўляючы найперш грунтоўнае метадалагічнае значэнне для кожнай з іх. Таму яе вылучэнне ў самастойны сегмент універсітэцкай адукацыі выступае як крок неабходны і прадуктыўны. З аднаго боку, яна арганічна дапоўніць стандартны ўніверсітэцкі курс філасофіі і яе вывучэнне дазволіць студэнтам больш глыбока і трывала засвоіць яго, а з іншага – яе спецыфічныя характарыстыкі паспрыяюць фарміраванню ў іх рознага кшталту спецыяльных (звязаных з валоданнем мовай, з моўнай культурай) навыкаў, уменняў і кампетэнцый.

Універсітэцкая адукацыя мае на мэце падрыхтоўку маладых людзей да самастойнай і творчай арганізацыі іх прафесійнай дзейнасці, што з неабходнасцю ўключае і развіццё навыкаў плённага навуковага пошуку. Справа ў тым, што паспяховая прафесійная дзейнасць у сучасных умовах немагчымая без сталай самаадукацыі, самастойнага вывучэння новых навуковых дасягненняў і, па сутнасці, без рэалізацыі ў той ці іншай ступені ўласных даследаванняў. Акрамя таго, універсітэт пакліканы рыхтаваць і навуковыя кадры – спецыялістаў, для якіх навуковы пошук з'яўляецца ядром прафесійнай дзейнасці. Як было падкрэслена вышэй, філасофія мовы мае грунтоўны метадалагічны патэнцыял. Таму яна істотным чынам звязана з логікай увогуле, а таксама з логікай і метадалогіяй навуковага пошуку, у сувязі з чым яе вывучэнне студэнтамі павінна паспрыяць развіццю ў іх схільнасцей, навыкаў, а таксама метадычнага інструментарыю, неабходных для вырашэння складаных даследчых задач. Акрамя таго, праз сваю сувязь з логікай і метадалогіяй навукі філасофія мовы здольная выступіць як паспяховы пасярэднік паміж прыродазнаўчымі, фармальнымі і сацыягума-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нітарнымі дысцыплінамі. Яе вывучэнне, такім чынам, можа істотна пашырыць светапоглядны і пазнавальны далягляд студэнтаў, а таксама будзе садзейнічаць фарміраванню ў іх схільнасці і здольнасці да вядзення міждысцыплінарнага дыялогу і здзяйснення міждысцыплінарнага сінтэзу, што ў найвышэйшай ступені запатрабавана ў сучасных умовах.

Надзвычай запатрабаванымі ў сучасных умовах з'яўляюцца і агульнакамунікатыўныя навыкі і кампетэнцыі, без якіх не можа абысціся спецыяліст у любой сферы. Відавочна, што філасофія мовымае дастаткова эфектыўныя сродкі для развіцця камунікатыўнай культуры асобы і грамадства. Разам з тым яе вывучэнне павінна дапамагчы студэнтам глыбей зразумець сутнасць сучаснай цывілізацыі, яе інфармацыйна-камунікатыўны характар, а таму і сутнасць сучаснага этапу ў разгортванні культурных працэсаў. Гэта надзвычай важна для маладых людзей, чыя прафесійная дзейнасць будзе звязана з развіццём культурнай сферы (магчыма, у асаблівай ступені для тых, хто абраў культуралагічныя спецыяльнасці). Адпаведныя веды, у сваю чаргу, дапамогуць ім лепш арыентавацца ў сацыяльным асяроддзі, прадбачыць і ўлічваць тэндэнцыі і перспектывы яго развіцця ў сваёй практычнай, прафесійнай дзейнасці, гэта значыць зрабіць яе больш паспяховай, што, натуральна, адпавядае грунтоўным інтарэсам грамадства ў цэлым.

*Мэта* вучэбнай дысцыпліны – развіццё мыслення студэнтаў,узбагачэнне яго метадалагічнага патэнцыялу, пашырэнне яго светапогляднага дыяпазону.

Для дасягнення дадзенай мэты неабходна вырашыць наступныя *асноўныя задачы:*

– сфарміраваць у студэнтаў навыкі моўна-філасофскага аналізу;

– раскрыць у працэсе выкладання сутнасць, структуру і змест моўна-філасофскага дыскурсу;

– сфарміраваць у студэнтаў навыкі лагічнага, метадалагічнага і метадычнага аналізу пэўнай пазнавальнай сітуацыі і прыняцця адпаведных ёй метадычных рашэнняў;

– забяспечыць засваенне імі ведаў пра гістарычную дынаміку моўна-філасофскіх даследаванняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У выніку вывучэння курса студэнты павінны *ведаць:*

– сутнасць, асаблівасці і структуру моўна-філасофскага пошуку як феномена культуры і тыпу кагнітыўнай дзейнасці;

– найважнейшыя метадалагічныястратэгііімоўна-філасофскіх даследаванняў у гістарычным плане і ў сучаснасці;

– асаблівасці асноўных гістарычных перыядаў развіцця філасофіі мовыў кантэксце разгортвання філасофскіх пошукаў у цэлым;

– асноўныя светапоглядныя арыенціры і наступствы моўна-філасофскіхдаследаванняў;

– метадычны арсенал філасофіі мовы.

Студэнты павінны *ўмець*:

– ужываць моўна-філасофскую тэрміналогію;

– характарызаваць асноўныя перыяды разгортвання моўна-філасофскага дыскурсу;

– аналізаваць у лагічным і метадалагічным плане пазнавальныя сітуацыі, моўна-філасофскія тэксты;

– прымаць адэкватныя пазнавальнай сітуацыі метадычныя рашэнні;

– выкарыстоўваць атрыманыя веды пры стварэнні і выкарыстанні інфармацыйных рэсурсаў філасофскага і навуказнаўчага профілю.

Студэнты павінны *валодаць*:

– разуменнем сацыяльнай значнасці і культурнай каштоўнасці мовы ў кантэксце працэсаў, што адбываюцца ў сучасным беларускім грамадстве;

– навыкамі лагічна-метадалагічнага аналізу і ацэнкі інфармацыйных паведамленняў, прапаноў і праектаў, звязаных з функцыянаваннем мовы ў грамадстве;

– навыкамі філасофскага аналізу канцэптуальных ідэй, на якіх грунтуюцца розныя моўна-філасофскія кірункі;

– здольнасцямі і навыкамі павышэння ўласнай моўнай культуры і станоўчага ўплыву на моўную культуру іншых;

– метадамі выкарыстання набытых у працэсе вывучэння дысцыпліны ведаў пры рашэнні прафесійных задач і выкананні сацыяльных функцый.

У адпаведнасці з указанымі вышэй мэтамі і прынцыпамі сацыяльна-гуманітарнай падрыхтоўкі студэнты павінны набыць наступныя **сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі:**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

САК-1. Валодаць якасцямі грамадзянскасці.

САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.

САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

САК-4. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі (крытычнае мысленне).

САК-5. Умець працаваць у камандзе.

У працэсе сацыяльна-гуманітарнай падрыхтоўкі студэнтыпавінны развіць наступныя **акадэмічныя кампетэнцыі**:

АК-1. Валодаць базавымі навукова-тэарэтычнымі ведамі і ўжываць іх для рашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК-2. Валодаць сістэмным і параўнальным аналізам.

АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі.

АК-4. Умець працаваць самастойна.

АК-5. Быць здольным выпрацоўваць новыя ідэі (крэатыўнасць).

АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем.

АК-7. Умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

Вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Філасофія мовы» прадугледжваецца 72 гадзіны, з якіх 34 гадзіны – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 26 гадзін, семінары – 8 гадзін. Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## *Уводзіны*

Філасофія мовы як вучэбная дысцыпліна, яе мэты і задачы. Філасофскае вымярэнне праблемы мовы як праблемнае поле курса. Светапоглядныя і лагічна-метадалагічныя асновы тэарэтычнага вывучэння феномена мовы як яго асноўны змест. Мова як прадмет філасофскай рэфлексіі і навуковага (спецыяльнага) аналізу: праблема ўзаемадачыненняў філасофіі і навукі ў кантэксце даследавання моўнай праблематыкі. Тэарэтычнае і практычнае значэнне філасофіі мовы для спецыяліста-гуманітарыя. Вучэбна-метадычнае забеспячэнне дысцыпліны.

## Раздзел 1. Праблема мовы ў гісторыі філасофіі

### *Тэма 1. Моўная праблематыка ў філасофскіх вучэннях Старажытнага Усходу*

Мова як прадмет філасофскага аналізу ў старажытнаіндыйскай культуры. Дасістэматычныя канцэпцыі мовы ў ведыйскіх тэкстах. Мова як боства і як боскі інструмент (у кантэксце стварэння Сусвету і кантролю над ім). Артыкуляцыя адрозненняў паміж сакральным і прафанным маўленнем. Мова як сродак дасягнення «містычнай уніі» ва Упанішадах. Разуменне і інтэрпрэтацыя мовы ў старажытнаіндыйскіх мовазнаўцаў. Філасофскія тэорыі сэнсу ў класічнай індыйскай філасофіі. Сэнс слова як вынік канвенцыі, запачаткаванай боскай сілай, у рамках н’яі і вайшэшыкі. Уяўленне прадстаўнікоў мімансы пра сувязь слова і яго сэнсу як вечную і нязменную. Згода індыйскіх філосафаў у вытлумачэнні сэнсу выказвання як вынікуспалучэння сэнсавых характарыстык яго складовых частак.Дыскусіі адносна характару спалучэння сэнсу слоў у выніковым сэнсе выказвання. Сэнс выказвання як сума сэнсаў яго кампанентаў у трактоўцы прыхільнікаў мімансы. Акцэнтуацыя сувязі слоў як крыніцы сэнсу выказвання ў рамках н’яі.

Моўная праблематыка ў класічнай кітайскай філасофіі. Засяроджанасць стражытнакітайскіх філосафаў на іменнай семантыцы (школа імён). Артыкуляцыя парадоксаў наймення ў класічным кітайскім філасофскім мысленні. Тоеснае і адрознае як

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

найважнейшыя катэгорыі семантычнага аналізу імён кітайскімі мысліцелямі, праблема дэмаркацыі тоеснага і рознага як цэнтральная ў стражытнакітайскіх філасофскіх спекуляцыях адносна мовы. Уяўленне пра адвольны характар меж паміж ідэнтычным і розным як крыніца рэлятывізму і сафізмаў.

### *Тэма 2. Вывучэнне феномена мовы ў антычнай філасофскай культуры*

Рэфлексія адносна мовы ў антычных міфічна-эпічных тэкстах. Праблема наймення ў Гамера і Гесіёда, у антычных лірыкаў і трагікаў. Імя, мысленне і існасць у філасофскіх пошуках дасакратыкаў. Станаўленне «канвенцыяналістычнага» падыходу да праблемы наймення (Дэмакрыт). Моўна-крытычная рэфлексія сафістаў. Тэарэтычна-пазнавальны скептыцызм у кантэксце мовы і вучэнне пра рытарычную магутнасць слова (Горгій). Класічная фармулёўка праблемы наймення Платонам (дыялог «Крацiл»). Грунтоўнае гістарычна-філасофскае значэнне платонаўскага падыходу да пытання пра праўдзівасць моўных выразаў (дыялог «Сафіст»). Супадзенне філасофскага і функцыянальнагааспектаў мовы ў Платона. Адрозненне паміж логасам і лексісам у арыстоцелеўскай філасофіі. Суадносіны «натуральнага» і «сімвалічнага» значэння моўных выразаў паводле Арыстоцеля.Слова як знак у арыстоцелеўскай філасофіі(«Deinterpretatione»). Канстатацыя адрозненняў паміж прагматычным і семантычна-сінтактычным аспектамі мовы ў перыпатэтыкаў. Мова як знак, што мае патрэбу ў інтэрпрэтацыі,у антычнай герменеўтыцы (Тэаген; метад алегарычнага вытлумачэння ў філасофіі стоікаў). Фарміраванне мовазнаўства як адносна самастойнай тэарэтычнай дысцыпліны ў рамках стаіцызму.Апарыі антычнай філасофіі мовы і яе гістарычнае значэнне.

### *Тэма 3. Моўная рэфлексія ў сярэдневяковай духоўнай традыцыі*

Грунтоўнае значэнне арыстоцелеўскай канцэпцыі мовы для Сярэдневякоўя. Мова сакральнага тэксту як найвышэйшая норма. Артыкуляцыя адрозненняў паміж рэлігійнай мовай і паўсядзённым маўленнем. Месца мовы ў сістэме «сямі свабодных мастацтваў» (працяг антычнай граматычнай традыцыі).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адмысловае значэнне лаціны ў сярэдневяковай заходняй культурыі яго адлюстраванне ў раннехрысціянскім моўна-філасофскім дыскурсе. Праблема суадносін мовы і хрысціянскага этасу. Знакавая натура мовы ў раннесярэдневяковых моўна-тэарэтычных даследаваннях. Мова як знак у патрыстыцы (герменеўтыка «бацькоў царквы»: Арыген, Аўгустын). Праблема асэнсаванасці чалавечага маўлення пра Бога (Псеўда-Дыянісій Арэапагіт).

«Рацыяналізацыя» граматыкі ў абсягу схаластычнай традыцыі. Сярэдневяковыя ўяўленні пра суадносіны граматыкі і логікі.Лагічна-семантычны аналіз мовы ў сярэдневяковай тэрміністычнай логіцы (Пётра Іспанскі, Уільям Окам). Мова як грунтоўная характарыстыка чалавека ў філасофіі Тамаша Аквіната. «Унутранае» і «знешняе» слова ў тамізме. Граматыка як вучэнне пра адэкватнае моўнае выяўленне паняцця духа ў «мадыстаў» (Мартын і Сімон з Дакіі, Сігер з Куртрэ). Праблема суадносін Боскага маўлення і чалавечай мовы ў сярэдневяковым містыцызме. Праблема ўзаемадачыненняў «народнай» мовы і лаціны ў Дантэ Аліг’еры: набліжэнне да паняццяў натуральнай і штучнай моў.

### *Тэма 4. Паняцце мовы ў філасофскай думцы Рэнесансу і ранняга Новага часу*

Адраджэнне антычнай рытарычнай традыцыі ў кантэксце гуманістычнага ідэалу (Ф.Петрарка). Тэза Мікалая Кузанскага пра «невыказальнае слова». Мова як выяўленне існага (Л.Вала). Усведамленне гістарычнай прыроды мовы ў рэнесансавым моўна-тэарэтычным дыскурсе (Х.Л.Вівэс).Рэнесансавая дыскусія пра суадносіны «вульгарных» і класічных моў (Д.Трысіёна, П.Пампанацы, С.Сперoні). Праблема пазнавальнага патэнцыялу мовы ў адраджэнскім скептыцызме (М.Мантэнь).

Кампаратывісцкі прынцып у «філасофскай граматыцы» Ф. Бэкана. Бэканаўская крытыка мовы як крыніцы забабонаў і магчымых памылак у спазнанні свету. Пачатак фарміравання традыцыі моўна-аналітычнай крытыкі метафізікі (Т.Гобс). Р. Дэкарт пра суадносіны мовы і мыслення. Картэзіянская крытыка паўсядзённага маўлення і ідэя ўніверсальнай – лагічнай і дакладнай – мовы. Радыкалізацыя моўна-крытычнай рэфлексіі ў філасофіі Б.Спінозы. Б.Спіноза пра гістарычны характар

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мовы і яго значэнне ў герменеўтычным кантэксце («Тэалагічна-палітычны трактат»). Ідэал штучнай універсальнай мовы ў пошуках Г.В.Ляйбніца. Наміналістычная канцэпцыя мовы ў брытанскім эмпірызме.

Прынцып адзінства мовы і мыслення ў асветніцкім моўна-філасофскім дыскурсе (Э.Кандзільяк). Вучэнне Э.Кандзільяка пра спецыфічную вызначанасць мовы як нацыянальнага ўтварэння. Асветніцкая дыскусія пра ўзнікненне мовы. Тэза Ж.-Ж. Русо пра духоўныя падставы генезісу моў.

Фантазія як крыніца мовы, мова як паэтычнае ўтварэнне ў Д. Віка. Рэлігійныя канцэпцыі ўзнікнення моў у XVIII ст. (І. Зюсмільх, І.Гаман). Антрапалагічнае абгрунтаванне моўна-філасофскага дыскурсу ў даследаваннях І.Г.Гердэра.

### *Тэма 5. Моўна-філасофская праблематыка ў нямецкім ідэалізме. Філасофія мовы ў XIX ст.*

Семіятычная канцэпцыя мовы ў філасофіі І.Канта (мова як сістэма адвольных знакаў). І.Кант пра неабходнасць «трансцэндэнтальнай граматыкі». Ідэя міметычнай першапачатковай мовы (Ursprache)у І.Г.Фіхтэ. Спроба стварэння «апрыёрнай гісторыі мовы» (рэканструкцыі натуральных моў на аснове першапачатковай мовы) у фіхтэанскай філасофіі. «Натуралізацыя» і «аб’ектывізацыя» мовы ў пошуках познягаІ.Г.Фіхтэ («Лісты да нямецкай нацыі»). Непадзельнасць свядомасці і мовы ў філасофіі Шэлінга. Артыкуляцыя надіндывідуальнага характару мовы ў гегелеўскай філасофіі. Мова як медыюм здзяйснення самасвядомасці («Фенаменалогія духа»). Мова як прадукт інтэлекту і як стыхія яго самавыяўлення. Тэза пра перавагу фанетычных моўных сістэм з пункту гледжання адпаведнасці духоўнаму зместу («Энцыклапедыя філасофскіх навук»).

Фармулёўка пытання пра спецыфіку філасофскага і канкрэтна-навуковага паняцця мовы В.фон Гумбальтам. Палажэнні В. фон Гумбальта пра мову як карціну свету і пра прыярытэт дыялагічнага пачатку ў мове і іх гістарычнае значэнне.Моўная рэфлексія ў кантэксце тэарэтычнага мовазнаўства.Разуменне мовы як арганізма ў рамантыкаў. Артыкуляцыя прагрэсіўнага характару развіцця мовы ў Я.Грыма. Пачатак моўна-псіхалагічных даследаванняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ТэзаА.Шапенгаўэра пра перавагу першапачатковай інстынктыўнай мовы перад развітымі моўнымі ўтварэнямі. Артыкуляцыя А.Шапенгаўэрам адмысловага характару моў (мова як стыль мыслення нацыі).

Выяўленне сувязі паміж мовай і свядомасцю ў кантэксце самастварэння чалавека ў працэсе працы ў даследаваннях К. Маркса. Адчужэнне мовы ў выніку адчужэння чалавека (ператварэнне «чалавечай» у «таварную» мову).

Праблема суадносін мовы і рэальнасці ў творчых пошуках Ф.Ніцшэ. Ніцшэанскае ўяўленне пра моўныя канвенцыі як скажэнне рэчаіснасці дзеля арыентацыі чалавека ў свеце і яго самазахавання. Ператварэнне першапачатковых метафарычных моўных знакаў у паняцці ў працэсе іх ужывання («Пра праўду і няпраўду ў пазамаральным сэнсе»). Філасофія як ахвяра мовы і замацаваных у ёй грунтоўных памылак («Генеалогія маралі»).

### *Тэма 6. Філасофія мовы ў ХХ – пач. ХХІ ст. «Linguisticturn»*

Пашырэнне і інтэнсіфікацыя моўна-філасофскага дыскурсу ў ХХ ст. Трансфармацыя філасофскіх праблем і падыходаў да іх рашэння праз зварот да сродкаў моўнага аналізу («Linguisticturn»).

Распрацоўка асноў лагічнага аналізу мовы ў творчасці Г. Фрэге. Тэза Г.Фрэге пра неабходнасць адназначнай штучнай мовы дзеля непасрэднай рэпрэзентацыі думак. Грунтоўны характар выяўлення рознасці паміж суб'ектыўным уяўленнем, сэнсам і значэннем. Перанос акцэнту семантычных даследаванняў са слова на выказванне. Уяўленне Г.Фрэге пра адсутнасць адназначнай, перадзададзенай адпаведнасці паміж лагічнай і граматычнай структурай выказвання.

Сутнасць мовы як выяўленне сутнасці свету (выказванне як мадэль рэчаіснасці)у філасофіі ранняга Л.Вітгенштайна («Tractatuslogico-philosophicus»). Палажэнне пра тоеснасць лагічнай структуры выказвання і лагічнай структуры рэальнасці. Тэза позняга Л.Вітгенштайна пра шматбаковасць мовы (разнастайнасць моў) і немагчымасць адзінай яе тэорыі. Мова як спосаб арганізацыі пэўных сфер жыцця. Тэндэнцыя да атаясамлівання рэпрэзентатыўных магчымасцей мовы і канстытутыўных характарыстык рэчаіснасці і яе небяспекі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тэза ранняга М.Хайдэгера пра маўленне як экзістэнцыяльна-анталагічны грунт мовы («Быццё і час»). Мова як «дом быцця» ў позняй хайдэгераўскай філасофіі («Сутнасць мовы»). Тэза Г.-Г.Гадамера пра ўніверсальны характар моўнай карціны свету. Разуменне як угрунтаванае ў мове здзяйсненне традыцыі.

Распрацоўка асноў структуралісцкай метадалогіі ў даследаваннях Ф.дэ Сасюра. Фундаментальнае значэнне вылучэння Ф.дэ Сасюрам сінхранічнага і дыяхранічнага аспектаў мовы і яе вывучэння. Мова як чалавечая здольнасць прамаўляць (language), як сістэма ўнутраных адрозненняў (langue) і як сукупнасць індывідуальных маўленчых актаў (parole). Развіццё ідэй Ф.дэ Сасюра ў мовазнаўстве (пражская фаналагічная школа, жэнеўская школа і інш.). Пераасэнсаванне вынікаў структурнай лінгвістыкі ў кантэксце даследавання сацыякультурных працэсаў і феноменаў (К.Леві-Строс).Трансфармацыя ідэй першапачатковага структуралізму ў постструктуралізме: праблематызацыя дачыненняў знака і азначанага, засяроджанасць на зменлівасці моўных і дыскурсіўных структур. Канцэпцыя нелінейнага пісьма (Р.Барт, Ж.Дэрыда).

Феміністкія моўна-філасофскія канцэпцыі: ад крытычнага выкрыцця маскуліннага разумення мовы да пазітыўных даследчых практык.

Развіццё марксісцкага погляду на мову ў неамарксізме (Т. Адорна). Тэорыя камунікатыўнага дзеяння (Ю.Хабермас).

Моўны дыскурс у сучаснай беларускай прасторы.

## Раздзел 2.Сістэматычнаефіласофскае вывучэннемовы: асноўныя кірункі і праблемы

### *Тэма 7.Мова і свядомасць*

Свядомасць і мова як вылучныя характарыстыкі чалавека.Узаемасувязь свядомасці, мыслення і мовы: праблема вызначальнага чынніка. Ідэя аналітычнай першаснасці мовы (прынцып лінгвістычнай адноснасці Сепіра-Уорфа, М.Даміт). Палажэнне пра першаснасць мыслення (гіпотэза пра мову мыслення Д.Фодара, Г.Грайс). Дачыненне свядомасці імовы як узаемадзеянне, мова як яго актыўны чыннік. Сацыяльны характар свядомасці, мовы і іх узаемадзеяння. Мова як аснова апасродкаванага дачынення чалавека да рэчаіснасці. Дылема

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыроджанасці – непрыроджанасці мовы. Эмпірычны (біхевіярысцкі) падыход: засваенне мовы як вынік досведу (У.Куайн). Тэорыя лінгвістычных універсалій як часткі генетычнай спадчыны людзей, якая ўплывае на засваенне мовы (Н.Хомскі). Пытанне пра мову ў кантэксце псіхафізіялагічнай праблемы (канекцыянізм, натывізм, эмерджэнтызм).

### *Тэма 8. Анталагічнае вымярэнне мовы (мова і рэальнасць)*

Семантычны і прагматычны аспекты мовы: праблема іх узаемадзеяння. Маўленне як спосаб быцця мовы і яго ўздзеянне на семантычна-сінтактычныя яе характарыстыкі (трансцэндэнтальна-герменеўтычная канцэпцыя мовы К.О.Апеля). Праблема суадносін мовы і рэчаіснасці ў кантэксце філасофскіх дыскусій адносна рэалізму і антырэалізму. Мова як дзейсны чыннік пераўтварэння рэчаіснасці. Дачыненні мовы і рэальнасці як аб’ект рэферэнцыйных тэорый. Сэнс і значэнне (інтэнсіянальны і экстэнсіянальны аспекты) моўных выразаў. Верыфікацыянісцкі (лагічны пазітывізм, М.Даміт), кампазіцыяналісцкі (Г.Фрэге, Д.Дэвідсан), канструктывісцкі (тэорыя маўленчага дзеяння), прагматысцкі (Ч.Пірс)падыходы да інтэрпрэтацыі моўнага сэнсу і значэння. Інтэнсіянальныя і экстэнсіянальныя характарыстыкі розных тыпаў моўных выразаў (змест і аб’ём імя, сэнс і лагічнае значэнне выказванняў).

### *Тэма 9. Лагічна-метадалагічны аспект філасофіі мовы*

Моўны аналіз як філасофскі метад: праблема статусу і характару. Метадалогія рэканструкцыі ведаў праз стварэнне штучнай, фармальнай мовы (філасофія ідэальнай мовы; Г. Фрэге, Б.Расэл, лагічны пазітывізм). Праблема інтэрпрэтацыі фармальных моў і метамоўны статус натуральнай мовы. Філасофія нармальнай мовы (позні Л.Вітгенштайн, Д.Остын, П.Стросан) і яе метадалагічны патэнцыял.

Структуралізм як метадалагічная «прышчэпка» (абгрунтаванне неабходнасці і плённасці метадаў структурнай лінгвістыкі ў сферы сацыягуманітарнага пазнання). Метадалагічная самаідэнтыфікацыя постструктуралізму. Тэза пра адсутнасць неабходнага (натуральнага) дачынення паміж знакам і азначаным і яго метадалагічныя наступствы (Ж.Дэрыда: дэканструк-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тывізм). Сінтэз структуралісцкай і псіхааналітычнай метадалогіі ў даследаваннях Ж.Лакана. Дыскурсіўны аналіз як метад выяўлення ўзаемасувязей паміж моўнай практыкай і моўнай формай, паміж моўнымі дзеяннямі і грамадскімі структурамі (М.Фуко).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА
# ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Назва раздела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|
| | лекцыі | семінарскія заняткі | | |
| Уводзіны | 1 | | | |
| **Раздзел 1. Праблема мовы ў гісторыі філасофіі** | | | | |
| Тэма 1. Моўная праблематыка ў філасофскіх вучэннях Старажытнага Усходу | 1 | | 2 | тэст |
| Тэма 2. Вывучэнне феномена мовы ў антычнай філасофскай культуры | 2 | 2 | | |
| Тэма 3. Моўная рэфлексія ў сярэдневяковай духоўнай традыцыі | 2 | | | |
| Тэма 4. Паняцце мовы ў філасофскай думцы Рэнесансу і ранняга Новага часу | 2 | | | |
| Тэма 5. Моўна-філасофская праблематыка ў нямецкім ідэалізме. Філасофія мовы ў XIX ст. | 2 | | 2 | дыскусія |
| Тэма 6. Філасофія мовы ў XX – пач. XXI ст. «Linguisticturn» | 2 | 2 | | |
| **Раздзел 2. Сістэматычнае філасофскае вывучэнне мовы: асноўныя кірункі і праблемы** | | | | |
| Тэма 7. Мова і свядомасць | 4 | 2 | | |
| Тэма 8. Анталагічнае вымярэнне мовы (мова і рэальнасць) | 4 | | 2 | вуснае апытанне |
| Тэма 9. Лагічна-метадалагічны аспект філасофіі мовы | 2 | | | |
| **Усяго…** | **22** | **6** | **6** | **залік** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура


*Асноўная*

1. *Аристотель.*Об истолковании / Аристотель //Сочинения : в 4 т. / Аристотель. – М., 1978.– Т. 2. – С. 91–116.
2. *Бартон, В.И.*Логика: учеб. пособие / В.И. Бартон.– Минск, 2000. – С.23–31.
3. *Конверський, А.* Логіка: підручникдля студентів вищихнавчальних закладів / А.Конверський. – Киев, 1999. – С. 35–43.
4. *Пичета, В. И.* Белорусский язык как фактор национально-культурный / В. И. Пичета. – Минск: Наука и техника, 1991. – 32 с.
5. *Платон.* Кратил / Платон // Собрание сочинений : в 4 т. – М. : Мысль, 1993.– Т. 2.
6. *Реале,Д.* Западная философия от истоков до наших дней: в 4 т. / Д.Реале, Д.Антисери. – СПб., 2003. – Т. 4.– С.252–258.

*Дадатковая*

1. *Барт, Р.* Избранные работы. Семиотика. Поэтика / Р. Барт. – М.: Прогресс, 1989. – 615 с.
2. *Гумбольдт, В. фон.* Избранные труды по языкознанию / В. фон Гумбольдт. – М.: Прогресс, 1984. – 400 с.
3. *Лакан, Ж.* Функция и поле речи и языка в психоанализе / Ж.Лакан. – М.: Гнозис, 1995. – 192 с.
4. *Лосев, А.Ф.* Философия имени / А.Ф.Лосев. – М.: Изд-во МГУ, 1990. – 270 с.
5. *Мащитько, О.В.* Лингвистические закономерности функционирования идеологии в современной культуре / О.В.Мащитько. – Минск: БГУКИ, 2015. – 236 с.
6. *Платон.* Софист / Платон // Собрание сочинений : в 4 т. – М. : Мысль, 1993.– Т. 2.
7. *Пятроўскі, Я.* Ідэі сьвятла і цеплыні / Я.Пятроўскі // Я. Пятроўскі. Грэцка-беларускі слоўнік: у 2 ч. – Gainesville: ByelorussianCharitableEducationalFund, Inc., 1983. – С.5–9.
8. *Сепир, Э.* Избранные труды по языкознанию и культурологии / Э.Сепир. – М.: Прогресс, 1993. – 656 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*9. Фреге, Г.* Избранные работы / Г.Фреге. – М.: ДИК, 1997. – 160 с.

*10. Фуко, М.*Слова и вещи: Археология гуманитарных наук / М. Фуко. – М.:Прогресс, 1977. – 488 с.

*11. Эко, У.* Поиски совершенного языка в европейской культуре / У.Эко. – М.: Александрия, 2007. – 430 с.

*12.* Deshpande, Madhav, «Language and Testimony in Classical Indian Philosophy», The Stanford Encyclopedia of Philosophy (Fall 2014 Edition), EdvardN.Zalta (ed.), URL = <http://plato.stanford.edu/archivs/fall2014/entries/language-india/>.

*13.*Fraser, Chris, «School of Names», TheStanfordEncyclopediaofPhilosophy (Fall 2014 Edition), EdvardN.Zalta (ed.),forthcomingURL = <http://plato.stanford.edu/archivs/win2015/entries/scool-names/>.

*14. Gadamer, H-.G.* Hermeneutik: Wahrheit und Methode. – 1. Grundzüge einer philosophischen Hermeneutik / H.-G. Gadamer. – Gesammelte Werke. – Bd. 1. – Tübingen: J. C. B. Mohr (Paul Siebeck), 1990. – 495 S.

*15. Heidegger, M.* Sein und Zeit/M. Heidegger. – Tübingen: Niemeyer, 1993. – 445 S.

*16.*Saul, Jennifer and Diaz-Leon, Esa, "Feminist Philosophy of Language", The Stanford Encyclopedia of Philosophy(Fall 2017 Edition), Edward N. Zalta(ed.), URL = <https://plato.stanford.edu/archives/fall2017/entries/feminism-language/>.

*17. Seiffert, H.* Sprache, allgemein und philosophisch / H. Seiffert // Handlexikon zur Wissenschaftstheorie / hrsg. Von H. Seiffert und G.Radnitzky. – München: Ehrenwirt, 1989. – S. 313–316.

*18.* TheBlackwellGuidetothePhilosophyofLanguage / ed. byM. DevittandR. Hanley. – Blackwellpublishing, 2006. – 446 p.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пералік сродкаў, што рэкамендуюцца для дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці

Дыягностыка вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў павінна мець рэгулярны, сістэматычны і комплексны характар. Дзеля гэтага неабходна ўжываць эфектыўныя, разнастайныя, рознаякасныя і рознаўзроўневыя сродкі кантролю і ацэнкі іх ведаў, уменняў і кампетэнцый. Па дысцыпліне «Філасофія мовы» рэкамендуюцца ў якасці такіх сродкаў:

– падрыхтоўка творчых прац (эсэ, рэфератаў) па тэмах дысцыпліны;

– падрыхтоўка дакладаў і міні-дакладаў для выступлення на семінарскіх занятках;

– падрыхтоўка прэзентацый па тэмах дысцыпліны;

– вусныя апытанні(на семінарскіх занятках і ў працэсе кантролю самастойнай працы);

– арганізацыя дыскусій па тэмах курса (на семінарскіх занятках і ў працэсе кантролю самастойнай працы) і кантроль ступені ўдзелу ў іх;

– выкананне тэставых заданняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Арганізацыя самастойнай працы студэнтаў

Самастойная праца студэнтаў з’яўляецца надзвычай важным кампанентам іх вучэбнай дзейнасці. Яна павінна мець сістэматычны характар, здзяйсняцца на добра прадуманай, карэктнай у дыдактычным плане аснове. Пры вывучэнні дысцыпліны «Філасофія мовы» надзвычай важнае значэнне ў гэтым кантэксце мае прапрацоўка першакрыніц, найбольш важных філасофскіх твораў, прысвечаных філасофскім праблемам, звязаным з мовай, яе сутнасцю і прызначэннем. Важным патрабаваннем, якое павінна быць выканана пры арганізацыі самастойнай працы студэнтаў, з’яўляецца таксама ўлік і актыўнае задзейнічанне міжпрадметных сувязей (сувязей з іншымі філасофскімі, а таксама культуралагічнымі дысцыплінамі).

## Прыкладныя заданні для кіраванай самастойнай працы студэнтаў

Пры вывучэнні дысцыпліны «Філасофія мовы» сістэма заданняў для кіраванай самастойнай працы можа ўключаць у сябе тыя іх тыпы, што адпавядаюць указаным вышэй найважней-

шым сродкам кантролю ведаў, навыкаў і кампетэнцый, набытых студэнтамі ў вучэбным працэсе, прапрацоўку лекцыйнага матэрыялу, тэкстаў першакрыніц, а таксама тэкстаў прапедэўтычнага характару, прапанаваных у якасці асноўнай і дадатковай літаратуры, з падрыхтоўкай канспектаў або творчых прац на іх аснове, падрыхтоўку адказаў на тыя пытанні для заліку, што выносяцца на самастойнае вывучэнне з распрацоўкай аналітычнага агляду літаратуры па адпаведнай тэматыцы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

# ФІЛАСОФІЯ МОВЫ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для ўсіх спецыяльнасцей універсітэта*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2020. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папераофісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,16. Ул.-выд. арк. 0,73. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнаевыкананне:
установаадукацыі
«Беларускідзяржаўныўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчаннеабдзяржаўнайрэгістрацыівыдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальнікадрукаваныхвыданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ